Пантэон Айчыны

# Ян Янавіч Глябовіч

*(1544—1590)*

**Ян Янавіч Глябовіч, які з 1571 да 1585 года займаў пасаду менскага кашталяна, — адна з самых выдатных постацяў у гісторыі Менска, Заслаўя. І ў гісторыі Беларусі ён пакінуў значны след.**

Род Глябовічаў паходзіў з праваслаўнай магілёўскай шляхты, яго маці Галіна была заслаўскай княгіняй. Бацька меў высокае палітычнае становішча, на схіле жыцця займеў нават пасаду канцлера. Да таго ж родная сувязі з Гедымінавічамі давалі маладому Глябовічу добрую магчымасць зрабіць бліскучую дзяржаўную кар'еру. Аднак Ян не шукаў гаспадарскай ласкі пры двары. З маладосці ён нёс вайсковую службу ў Полацку і ўдзельнічаў у абароне яго ад войска маскоўскага цара Івана Грознага. Смелы юнак не пагадзіўся з полацкім ваяводам Станіславам Давойнам, які адмовіўся прыняць у замак 20 тысяч уцекачоў. Ян Глябовіч хацеў узначаліць уцекачоў і павесці іх у бой. Ваявода не дазволіў. А можа, і дарэмна... Полацк не ўстаяў. Ян Глябовіч трапіў у палон.

Іван Грозны меў свае інтарэсы да знатнага літвіна, прыхільна ставіўся да яго, вёў з ім дыскусіі аб рэлігіі. А пасля прапанаваў яму пасадзейнічаць схіліць літвінскіх і польскіх дыгнітарыяў абраць яго польскім каралём і вялікім князем літоўскім. Глябовіч, каб вырвацца з няволі, даў згоду на справу, якую не збіраўся ажыццяўляць, і быў вызвалены з палону.

Свой шлях на вяршыні ўлады Ян Глябовіч пачаў з пасады менскага кашталяна, якую атрымаў у 1571 годзе. Пэўна, выбар Глябовіча на гэта месца быў абумоўлены тым, што ён жыў у Заслаўі і меў павагу сярод менскай шляхты. Апроч палітычнай і дзяржаўнай дзейнасці менскі кашталян шмат увагі аддаваў і асветніцкай справе. У Заслаўі ён пабудаваў велічны рэфарматарскі збор, дзе сам служыў пастарам, заснаваў друкарню. Некаторы час па запрашэнні Глябовіча ў Заслаўі жыў і славуты беларускі філосаф і тэолаг Сымон Будны. Менавіта ў Заслаўі ў 1574 годзе быў надрукаваны пераклад Бібліі Сымона Буднага.

Значэнне менскага кашталяна ў дзяржаве паступова ўзрастала. Тагачасныя дакументы



Ян Глебовіч, каштэлян Менскі, 1582. Воск, чырвоны, ∅ 23,3. Ф. Р., воп. 4, спр. 1476, арк. 3

сведчаць пра найактыўнейшы ўдзел Глябовіча ў палітычным жыцці краіны. Асабліва прыкметная яго роля ў прызнанні Стафана Баторыя вялікім князем літоўскім. У 1576 годзе Глябовіч узначаліў літвінскую дэлегацыю да Баторыя. Ад імя літвінскіх станаў Глябовіч указаў Баторыю (якога тытулаваў толькі каралём) на дагавор уніі, дзе гаварылася, што адзін народ не павінен нічога абмяркоўваць без ведама іншага, а таксама асобна выбіраць уладара. А Баторый, нягледзячы на тое, што літвіны не выбіралі яго і не запрашалі на велікакняжацкі пасад, ужывае тытул вялікага князя літоўскага. А таму Літва не прызнае яго за свайго гаспадара. Рэзка і прама Ян Глябовіч заявіў у сенаце: «Вы, палякі, вырвалі ўсё з нашых рук, вы несправядлівым чынам зняважылі нас, не далі нам удзельнічаць у элекцыі і каралеўскай каранацыі. Таму мы пратэстуем супраць парушэння нашых правоў праз каранацыю, якую ўчынілі супраць нашага ведама, і мы ўжо вызвалены ад вузаў уніі з Польшчай».

Тым не менш Ян Глябовіч падтрымаў батарыянскую партыю і разам з Янам Хадкевічам агітаваў літвінскую шляхту і магнатэрыю прызнаць Баторыя вялікім князем. Іх намаганні займелі поспех. Выбранне Баторыя ўладаром Вялікага Княства Літоўскага паспрыяла і ўзвышэнню аўтарытэту Яна Глябовіча. Характэрны такі выпадак: калі ў сенаце польскі бок пачаў прэтэндаваць на Лівонію, дык угневаны Глябовіч пакінуў сенатарскую палату. Дэмарш менскага кашталяна прымусіў Баторыя шукаць кампраміс — падзяліць Лівонію паміж Каронай і Княствам.

Палітычная вага Глябовіча ўзрасла пасля таго, як ён атрымаў пасаду падскарбія — узначаліў дзяржаўную скарбніцу. Прызначэнне было дарэчы, бо паўплывала і на лёс Менска. У 1581 годзе ў Вялікім Княстве быў створаны вышэйшы апеляцыйны суд — Трыбунал. І Менск разам з Вільняй і Навагрудкам выбралі для пасяджэнняў Трыбунала.

У 1585 годзе Ян Глябовіч стаў троцкім кашталянам, а праз год — і троцкім ваяводам. Вяршыняй дзяржаўнай дзейнасці Яна Глябовіча па праве трэба лічыць выдатную дыпламатычную перамогу — зацвярджэнне трэцяга Статута Вялікага Княства Літоўскага. Ян Глябовіч узначаліў літвінскую дэлегацыю да выбранага ў 1588 годзе палякамі караля польскага Жыгімонта Вазы. Перад ім стаяла адказная задача — дамагчыся зацвярджэння ранейшых прывілеяў Княства і Статута. У значнай ступені лёс беларускай дзяржавы залежаў ад палітычнай сталасці і дыпламатычнай вытрымкі Яна Глябовіча. Ён выдатна справіўся з пастаўленай задачай. Глябовіч і яго паплечнік падканцлер Леў Сапега занялі цвёрдую пазіцыю ў адносінах да Жыгімонта Вазы, патрабуючы ад яго прызнання літвінскіх умоў, паводле якіх ён мог быць выбраны вялікім князем. Жыгімонт Ваза пад націскам польскіх саноўнікаў адмаўляўся прымаць літвінскія ўмовы. І тады Глябовіч і Сапега пайшлі на хітры дыпламатычны крок: атрымаўшы раней за прыхільнікаў Вазы паведамленне аб перамозе польскага войска над другім прэтэндэнтам на пасад Рэчы Паспалітай — Максіміліянам Габсбургам, яны катэгарычна заявілі, што калі Жыгімонт і каранацыйны сойм не прымуць умоў Вялікага Княства, дык яны пакінуць Кракаў. Ваза і сойм саступілі. Былі прызнаны перамір'е Рэчы Паспалітай з Масковіяй, падзел Лівоніі паміж Каронай і Княствам, а галоўнае — без вывучэння, абмеркавання і згоды палякаў зацверджаны Статут. Бліскучая дыпламатычная перамога! Статут аднаўляў палітычныя страты Вялікага Княства пры заключэнні Люблінскай уніі. Вялікае Княства Літоўскае не толькі захавала свой дзяржаўны суверэнітэт, але і атрымала самы дасканалы звод законаў у Еўропе.

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

Сваімі словамі



# ЛАНЦУЖКІ МОЦЫ

**Шмат у жыцці здараецца выпадковых сустрэч. Некаторыя з іх з'яўляюцца лёсавызначальнымі. Ёсць і такія, якія мы прызначаем самі, — і толькі пасля разумеем, наколькі правільна зрабілі. І думаем, што было б, калі б гэтага маленькага прыпынку на карце нашага руху не адбылося...**



Памятаю, як тата папрасіў перадаць стрыечнай бабулі, якая жыве ў Мінску, слоік мёду. Гэту бабулю на той момант я не бачыла ўжо гадоў шэсць. Жыве яна на іншым краі сталіцы — у раёне, дзе я зазвычай не бываю. Да таго ж ехаць трэба было ў выхадны дзень, у халоднае надвор'е. Таму, скажу шчыра, рабіць мне гэтага не хацелася. Пэўны час я змагалася з сабой, але вырашыла ўсё-такі выканаць просьбу. Стрыечную бабулю, між іншым, клічуць Ніна, як і мяне.

Сям'я сваякоў, як аказалася, жыве ў тыповай сталінцы. Надзвычай высокія столі, даволі шмат прасторы — было цікава трапіць у такі свет. Ніна Цімафееўна, як і ўсе бабулі, адразу пастаралася мяне накарміць. Калі ж ад ежы я адмовілася, то ад кубачка напою — не змагла. Кава, здобраная згушчаным малаком, шакаладныя цукеркі, глазураваныя сыркі, шакаладка — чамусьці я ўсё гэта памятаю надзвычай добра, хоць нярэдка бываю ў гасцях, дзе мяне частуюць. Можа быць, колькасць шакаладу на квадратны сантыметр сыграла сваю ролю! Да таго ж адчувалася тая цеплыня, з якой мяне частаваў родны чалавек.

Спачатку пагутарылі пра тое, як справы ў родных, хто чым жыве. А пасля ці то спрацавала мая журналісцкая звычка задаваць пытанні, ці то я даўно мела такую ўнутраную патрэбу... Але, паколькі ў бабулі і дзядулі я не паспела распытаць пра сваіх прадзедаў па гэтай лініі, я зразумела, што родная сястра, натуральна ж, таксама шмат што можа распавесці!

Па меры таго, як я распытвала, перад вачыма паўставаў невядомы раней свет маіх продкаў. Найперш уразіла тое, што ў прадзеда, аказваецца, было прозвішча Багушэвіч! Можа быць, ён і не сваяк «таму самаму». Але ж адразу ўсплывае ў галаве: «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі...» І гэта шмат што для мяне значыць. Яшчэ прадзед вучыўся ў духоўнай семінарыі і скончыў яе на выдатна. Такія факты таксама істотныя. Калі духоўнасць была важнай для сям'і — гэта падстава, каб яна была важнай і для мяне. Ну а тое, што прадзед скончыў вучобу на выдатна, стымулюе таксама ўсё рабіць як мага лепш.

Незадоўга да той сустрэчы я трапіла на псіхалагічны трэнінг у родным горадзе, арганізаваны маёй колішняй настаўніцай. Дык вось, сутнасць яго ў тым, каб прыгадаць (даведацца, запісаць) моцныя рысы сваіх прамых сваякоў — бацькі, маці, бабулі, дзядулі, прабабулі, прадзядулі і гэтак далей. Яшчэ трэба даведацца, кім яны былі і кім марылі быць! Напрыклад, ваша бабуля працавала гандляркай, але марыла быць спявачкай, мела выдатны голас і часам выступала на сяброўскіх сустрэчах. Такі факт можа растлумачыць ваша ўласнае імкненне спяваць — надасць упэўненасці і моцы, каб рэалізаваць уласныя спеўныя здольнасці. Яны ўжо не проста нейкія дурыкі — гэта спадчынны талент! Псіхолагі сцвярджаюць, што такія веды — наш унутраны рэсурс. Ім трэба карыстацца!

Родныя аднойчы сыдуць, хоць і не хочацца думаць пра гэта. Трэба распытаць, запісаць, сфатаграфаваць, запомніць. Знаўцы кажуць, што такія веды надзвычай каштоўныя для нашага асабістага жыцця. І мы таксама ведаем, што гэта сапраўдны скарб.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

Запрашальнік



# СЭЛФІ З 1970-х,

## або Працягваючы традыцыі Любчанскага фатографа Савы Сіўко

**Учора ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі адчыніўся своеасаблівы праціяг выстаўкі «Сава Сіўко (1888—1978). Фатограф Любчанскага краю. Да 130-годдзя з дня нараджэння», якая паспела палюбіцца наведвальнікам. Нагадаем, што гэта выстаўка стала магчымай дзякуючы таму, што ў звычайнай вясковай хаце былі знойдзены старыя негатывы, якія і сталі асновай выстаўкі. Новая экспазіцыя з'яўляецца яе працягам і называецца «Любчанскі край. Людзі і час».**

Арганізатары адзначаюць, што стварэннем такой экспазіцыі яны імкнуцца зберагчы, вывучыць фатаграфічную спадчыну Савы Сіўко і працягнуць фоталетапіс Любчанскага краю праз адкрыццё новых імёнаў у гісторыі беларускай фатаграфіі.

На выстаўцы прадстаўлены фатаграфіі такіх беларускіх аўтараў, як Альберт Цэхановіч, Андрэй Васкрасенскі, Марыя Банэ і Вольга Сяргеева. Усе яны праз родзічаў звязаныя з Любчанскім краем. Тут жа можна ўбачыць і работы фатографа-аматара з вёскі Нянькава Івана Ігнатавіча Камара.

На жанравых здымках Альберта Цэхановіча — вясковыя доўгажыхары, якіх фатаграфаваў Сава Сіўко, і якія добра памятаюць фатографа. Другая серыя прадстаўляе партрэты нашчадкаў герояў з фотаздымкаў Савы Сіўко, зробленыя на фатаграфічным фоне, адрэстаўраваным мастаком-рэстаўратарам музея Юліяй Дранец.

Фатаграфічная серыя «Сямейны альбом» Андрэя Васкрасенскага, галоўным героем якой з'яўляецца яго сын Леў, распавядае пра таямніцы памяці і радавое дрэва, частка каранёў якога па матчынай лініі таксама схавана ў Любчанскім краі.

Тэма твораў Марыі Банэ звязана з Нёманам і згадкамі пра яго. Працуючы над тэмай, яна своеасабліва пераасэнсавала і аб'яднала ў адной мастацкай прасторы ўласныя дзіцячыя ўспаміны, «дарослы» вопыт і архіўныя фотаздымкі родных, жыхароў Любчы і ваколіц.

Сучасны выгляд мясцін, якія фатаграфаваў Сава Сіўко, — панарама Любчы, крыж на магілу Пуслоўскіх і царква ў вёсцы Гнесічы, — прадстаўляюць творы Вольгі Сяргеевай.

Падчас экспедыцый па мясцінах, звязаных з жыццём і творчасцю Савы Сіўко, і сустрэч с землякамі майстра і сведкамі яго працы высветлілася, што 98-гадовы жыхар вёскі Нянькава Іван Ігнатавіч Камар на працягу дваццаці гадоў, з 1958-га да 1979-га, фатаграфаваў жыхароў роднага краю. Такім чынам, у гісторыі беларускай фатаграфіі з'явілася яшчэ адно імя. На выстаўцы ён прадстаўлены серыяй аўтапартрэтаў (па сучаснаму «сэлфі») і фатаграфіямі родных і аднавяскоўцаў з маленства да сталасці.

Выстаўка будзе працаваць да 3 лютага.

**Варвара ГОМАН.**